Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЖНІЎНЯ 2017 г. СУБОТА №164 (28528)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Ці варта пазычаць грошы сябру «УКантакце»

СТАР. 4



Што здымае «Беларусьфільм»

СТАР. 8



Экстрым ад... нашых чытачоў

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, намеснік міністра эканомікі:**

*«У якасці асноўных рэзерваў для падтрымання тэмпаў росту на ўзроўні вышэй за 105% трэба адзначыць рэалізацыю шэрагу інвестпраектаў у лёгкай прамысловасці і вытворчасці аўтамабільных шын, рост адгрузак прадукцыі айчыннага машынабудавання на рынкі Расіі, выкарыстанне спрыяльнай кан'юнктуры на рынку калійных угнаенняў. Трэба адзначыць, што дынаміка росту зарплаты і грашовых даходаў насельніцтва становіцца драйверам росту рознічнага тавараабароту і ў цэлым акажа стымуляцыйны ўплыў на развіццё сферы паслуг».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9334 | ▼ |
| Еўра | 2,2789 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0756 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# «Запаведная» дынастыя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Валерый і Яўгенія ІЎКОВІЧЫ амаль сорак гадоў таму пачалі сваю навуковую прыродаахоўную дзейнасць у Бярэзінскім біясферным запаведніку, абаранілі дысертацыі, сталі кандыдатамі сельскагаспадарчых навук. Унёсак гэтай сям'і ў беларускую навуку вялікі. Яўгенія Мікалаеўна з'яўляецца вядучым навуковым супрацоўнікам і з групай батанікаў вядзе маніторынг флоры на ўсёй тэрыторыі запаведніка. Валерый Сямёнавіч — балотазнавец, намеснік дырэктара запаведніка па навуцы. Іхнія сыны Дзяніс і Арцём таксама шчыруюць на ніве аховы навакольнага асяроддзя — пасля заканчэння ВНУ яны вярнуліся на радзіму і працуюць побач з бацькамі. Дзяніс — біёлаг, займаецца экалогіяй адкрытых экасістэм, а малодшы Арцём — вядучы інжынер лясной гаспадаркі запаведніка.**

■ Сітуацыя

## НЕДАБОР У... АРМІЮ

### У Гродзенскай вобласці за апошнія 10 гадоў узровень прыдатнасці юнакоў да воінскай службы знізіўся на 20%

**Хоць праз прызыўныя камісіі сёлета прайшло больш за пяць тысяч юнакоў, у рады Узброеных Сіл трапіла толькі 1400 чалавек. А гэта на паўтары сотні менш даведзенага плана. Прычыны недабору розныя. Гэта і недастатковая колькасць прызыўных рэсурсаў, і вялікі працэнт адтэрміновкі (72%), і вялікая колькасць тых, хто мае праблемы са здароўем.**

### Абы «адкасіць»

З'явілася і новая тэндэнцыя. Некаторыя з тых, хто не жадае служыць, але не мае адпаведных падстаў для гэтага, знайшлі нечаканае выйсце. Напрыклад, падчас вясновага прызыву некалькі маладых людзей у стане моцнага алкагольнага ап'янення атрымалі адміністрацыйныя пакаранні. І гэта адбылося літаральна перад адпраўкай. Такі кураж дазволіў ім трапіць у разрад тых прызыўнікоў, якім не рэкамендавана служба ў арміі. На думку **намесніка начальніка ваеннага камісарыята Аляксандра ВЯНСКОВІЧА**, гэта не што іншае, як ухіленне ад прызыву. Ён лічыць, што новая з'ява можа распаўсюдзіцца, і гэты паток трэба як мага хутчэй спыніць.

Разам з тым у армію не павінны трапіць асобы, якія пакутуюць на залежнасць ад алкаголю. Так атрымалася з Андрэем К. Хлопец падчас прызыўной кампаніі атрымаў неблагую характарыстыку ад участковага міліцыянера, родныя пацвердзілі, што ён не злоўжывае спіртным. У выніку 25-гадовы прызыўнік быў адпраўлены выконваць свой воінскі абавязак. Але ўжо на другі дзень у яго праявіўся сіндром алкагольнай залежнасці. Аказалася, што ён з 15 гадоў пачаў злоўжываць спіртным. Праходзіў стацыянарнае лячэнне ад алкагалізму. Ездзіў на невялікі тэрмін на работу ў Маскву, пасля чаго некалькі тыдняў не «прасыхаў». А сваё провады ў армію адзначаў два тыдні. У рэшце рэшт хлопца прыйшлося адправіць на лячэнне.

З прычыны алкагольнай залежнасці не прызнаны годнымі да службы 354 прызыўнікі, і гэтая лічба павялічваецца. У некаторых раёнах яна вырасла ў два разы. Аляксандр Вянсковіч лічыць, што гэту праблему нельга замоўчваць.

СТАР. 7

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Чытаеш па-беларуску — і быццам гаворыш на роднай мове»



**Віктар РОІК, старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў:**

Жывучы ў Беларусі, мы абавязкова павінны карыстацца сваёй мовай. Мая ўнучка-падлетак усё лета чытала па-беларуску, і на дапамогу ёй акрамя кніг прыходзіла, часам, і «Звязда». Я сам у свой час 9 класаў скончыў па-беларуску, а пасля жыццёвыя абставіны вымусілі мяне пераключыцца на рускую мову. Аднак у душы любоў да беларускай мовы засталася і будзе ў ёй, і «Звязда» дапамагае яе захоўваць. Чытаеш па-беларуску — і быццам гаворыш на роднай мове.

Сама па сабе газета цікавая, і падача матэрыялу асаблівая, толькі ёй уласцівая. «Звязда» мае свой уласны каларыт. У выданні шмат тэматычных укладак, але мне з прафесійнай пазіцыі вельмі карысная здаецца «Мясцовае самакіраванне». Але тут жа вам і пра жывёл, і пра агарод. Часам, нешта і выразаю, бо інфармацыя заўжды актуальная.

І каманда ў «Звяздзе» падабралася прыстойная, цікавая. Чытаеш, і бачыш асобу кожнага, пазнаеш яго почырк, ведаеш уласныя цікавыя пазіцыі, меркаванні асобных аўтараў. Часам, хочацца з імі і паспрачацца, і пагадзіцца, але не застаешся раўнадушным ні да манеры выкладання, ні да саміх матэрыялаў.

Прыгажосць кожнай мясцовасці журналісты падкрэсляць, прафесійна і прыгожа выкладуць, і за гэтае ўменне, за тое, як яны паказваюць народныя традыцыі, вельмі паважаю газету. Чытаю — проста радуюся.

Калі прыязджаюць вашы карэспандэнты да нас на раён і размаўляюць з людзьмі, а пасля я іх сустракаю дзесьці, то адразу гаворка заходзіць пра «Звязду», успамінаюць. Не раз бачыў, як журналісты гутараць з мясцовымі, як стараюцца ўнікнуць у праблему, каб кожны штрышок заўважыць і перадаць.

Малайцы, так і працягвайце, на тым жа ўзроўні! Любім вас за вашу своеасаблівасць і прафесіяналізм, за спрадвечную беларускую мову.